В тоже время прогресс в отношениях между двумя частями Германии, а в более широком контексте между Востоком и Западом, мог быть достигнут только в том случае, если возможным соглашениям в сфере общих интересов не будут препятствовать невыполнимые предварительные условиями. В частности, вопрос о признании ГДР в соответствии с международным правом, на котором настаивал СССР и о котором, по заявлению В. Брандта в октябре 1967 г. «не могло быть и речи» [7]. Для ФРГ этот вопрос не являлся предметом переговоров и дискуссий. Однако в декабре 1967 г. под влиянием союзников по НАТО и в первую очередь Великобритании позиция правительства ФРГ по вопросу отказа от доктрины Хальштейна и признания ГДР странами «у которых никогда не было самостоятельного выбора по поводу установления дипломатических отношений с ГДР» кардинально изменится [1, с. 102].


1. Чепик, В. Н. От национальных государств к единой Европе. Проблема западноевропейской интеграции во внешней политике Великобритании: военно-политический аспект (1961–1975) / В. Н. Чепик, В. Н. Борисенко. – СПб. : РХГА, 2016. – 160 с.
2. Interview mit Willy Brandt über die europäische Friedensordnung [Electronic resource] : Sozialdemokratischer Pressedienst. 14.07.1967 (P/XXII/132). Bonn // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/"interview_mit_willy_brandt_uber_die_europaische_friedensordnung"_in_sozialdemokratischer_pressedienst_14_juli_1967-de-b7c32810-822e-49f5-93f1-7ad03528743d.html. – Date of access: 28.10.2021.
3. Rede von Willy Brandt vor der Foreign Policy Association [Electronic resource] : New York, 15. Mai 1964 // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/rede_von_willy_brandt_vor_der_foreign_policy_association_new_york_15_mai_1964de-7b38bb65-5b5c-4f59-abd1-b81e507cfbd2.html. – Date of access: 28.10.2021.
4. Rede von Willy Brandt vor dem Bundestag über die Vollendung der Europäischen Gemeinschaften [Electronic resource] : Bonn, 22. Februar 1967 // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/rede_von_willy_brandt_vor_dem_bundestag_uber_die_vollendung_der_europaischen_gemeinschaften_bonn_22_februar_1967-de-2ef69dde-8c84-459c-8ed8-a960b0d03b18.html. – Date of access: 28.10.2021.
5. Rede von Willy Brandt über Gemeinschaftsideale und nationale Interessen in der deutschen Außenpolitik [Electronic resource] : Bad Godesberg, 11 Juni 1964 // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/rede_von_willy_brandt_uber_gemeinschaftsideale_und_nationale_interessen_in_der_deutschen _außenpolitik_bad_godesberg_11_juin_1964-de-0b2f2bef-a204-4544-8a65-5a7a3ad2afcd.html. – Date of access: 28.10.2021.
6. Rede von Willy Brandt über die Lage der Nation [Electronic resource] : Protokoll der Verhandlungen des Parteitages der Sozialdemokratischen Partei Deutschlands vom 1. bis 5. Juni 1966 in Dortmund. Bonn // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/rede_von_willy_brandt_uber_die_lage_der_nation_dortmund_1_5_juni_1966-decec6ebf1-6954-48c5-940c-66bf4f60467e.html. – Date of access: 28.10.2021.
7. Rede von Willy Brandt vor dem Bundestag über die Europapolitik [Electronic resource] : Bonn, 13. Oktober 1967 // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/rede_von_willy_brandt_vor_dem_bundestag_uber_die_europapolitik_bonn_13_oktober_1967de-4e3059a6-1577-46b5-87ce-b4e5a1135fc8.html. – Date of access: 28.10.2021.
8. Vortrag von Willy Brandt auf der Jahrestagung des Kuratoriums der Friedrich EbertStiftung in Düsseldorf (30. November 1967) [Electronic resource] : Bulletin des Presse- und Informationsamtes der Bundesregierung. 01.12.1967 (139). Bonn // CVCE.eu. – Mode of access: http://www.cvce.eu/obj/rede_von_willy_brandt_uber_die_verantwortung_der_deutschen_gegenuber_europa_dusseldorf_30_november_1967-de-d7e36a61-2a9f-4f4a-be01-4d1d88b39fc5.html. – Date of access: 28.10.2021.


**Пушкін І.А.**

## ЗАМЕЖНЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ НА ПРАМЫСЛОВЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ Ў 1970–1980 ГГ. (ПАВОДЛЕ ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ КРЫНІЦ)

У беларускай савецкай [1; 2] і сучаснай гістарыяграфіі [3; 4; 7; 8; 10], у кантэксце пашырэння эканамічных, грамадска-палітычных і культурных сувязей БССР з рэспублікамі СССР і замежнымі краінамі, адзначана, што на прадпрыемствах рэспублікі выкарыстоўваўся тэхналагічны вопыт і абсталяванне краін Заходняй Еўропы, а таксама сацыялістычных дзяржаў, якія аб'ядноўваліся ў рамках Савета Эканамічнай Узаемадапамогі. У некаторых навуковых публікацыях даследавалася роля замежных спецыялістаў пры фарміраванні прамысловага патэнцыяла ўсходнебеларускіх рэгіёнаў [9].

Дзейнасць замежных спецыялістаў на прамысловых прадпрыемствах Магілёўшчыны і іх успрынящце савецкай рэчаіснасці дазваляюць раскрыць паведамленні і запіскі Упраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі (КДБ) па Магілёўскай вобласці аб эфектыўнасці выкарыстання замежных спецыялістаў. Дадзеныя дакументы накіроўваліся на імя першага сакратара абласнога камітэта КПБ і сёння захоўваюцца ў Дзяржаўным архіве грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці [5; 6].

На працягу 1970–1980-х гг. у адпаведнасці з падпісанымі кантрактамі на шэрагу прадпрыемстваў БССР шэфмантажныя (выкананне работ па мантажы, падключэнню і наладцы абсталявання персаналам заказчыка пад кіраўніцтвам персаналу пастаўшчыка) і пусканаладачныя работы ажыццяўлялі замежныя спецыялісты з ГДР, ФРГ, Англіі, Галандыі, Японіі, Італіі, Югаславіі і іншых краін. На Магілёўскім ВА "Хімвалакно" і ВА "Бабруйскшына" у мантажы і пуску асобных вытворчасцей, прымалі ўдзел прадстаўнікі фірмаў ФРГ "Хэхст", "Круп-Коперс", "Фр. Удэ" і "Бюлер-Міаг", японскай "Міцуі-Торэ", англійскай "Сайман-Карлз", італьянскіх "Фата" і "Пірэлі". Мантаж і наладку імпартнага абсталявання на камбінаце шаўковых тканін (КШТ) рабілі спецыялісты галандскіх фірмаў "Шторк" і "Сайтэкс", японскай "Вакаяма-Тэко", заходнегерманскіх "Хэхст" і "Унан Матэкс". Так, на шэфмантажных работах штапельнай вытворчасці бесперапынным спосабам Магілёўскага камбіната сінтэтыч-

нага валакна імя Леніна з чэрвеня 1972 г. знаходзілася 20 спецыялістаў ГДР фірмы "Інвест-Экспарт", з іх 8 з жонкамі і дзецьмі. На заводзе "Электрарухавік" у мантажы аўтаматычнай лініі прымалі ўдзел 4 спецыялісты з ГДР [5, арк. 20]; у 1981–1982 гг. на МВА "Хімвалакно" з дапамогай замежных фірмаў ажыццяўляліся шэфмантажныя і пуска-наладачныя працы на трох вытворчасцях: атрыманне дэметылтэрэфталата-4 (фірма "Круп-Коперс", ФРГ), поліэтылентэрэфталату (фірмы "Фр. Удэ" і "Хэхст", ФРГ), поліэфірных тэкстыльных нітак (фірма "Міцуі-Торэ", Японія). У 1979 г. знешнегандлёвае аб'яднанне (ЗГА) "Тэхмашімпарт" падпісала кантракт з японскімі фірмамі "Макаява", "Міцубісі" і "Тае Рабер" аб будаўніцтве ў г. Бабруйску завода звышбуйнагабарытных шын. Штогод колькасць шэфмантажнікаў з ФРГ і Японіі склала ў сярэднім 120 чалавек [6, арк. 34, 44].

У 1975–1980 гг. у Магілёўскай вобласці працавала звыш 700 замежных спецыялістаў з 26 фірмаў 10 капіталістычных краін тэрмінам ад некалькіх дзён да 2–3 гадоў. Замежныя спецыялісты, у сваёй большасці, валодалі дастатковай кваліфікацыяй і ведамі па ўсталёўцы і наладцы абсталявання, але і былі асобы з нізкім узроўнем прафесійнай падрыхтоўкі. Пад час правядзення работ былі выяўлены і задакументаваны факты парушэнняў тэхнічных умоў і якасці ўстаноўкі імпартнага абсталявання з боку шэфмантажнікаў.

Толькі за памылкі пры мантажы абсталявання на вытворчасцях "Дэметылтэрэфталата-4" і "Штапель-3" (ВА "Хімвалакно") фірмы "Круп" і "Фр. Удэ" выдаткавалі 300 тыс. заходнегерманскіх марак. Прычынай названых недахопаў, нароўні са слабай кваліфікацыяй замежных спецыялістаў, з'яўляліся недакладнасці ў праектнай дакументацыі. Упраўленнем КДБ па Магілёўскай вобласці было ўстаноўлена, што з боку заходніх фірмаў "Круп-Коперс", "Хэхст-Удэ", "Бюлер-Міаг", "Шторк" мелі месца выпадкі паставак на ВА "Хімвалакно", "Бабруйсшына" і КШТ дэфектнага і маральна састарэлага абсталявання і тэхналогій. Эксплуатацыя і ўжыванне іх была эканамічна не выгадныя, прыводзіла да забруджвання навакольнага асяроддзя. Для ліквідацыі дэфектаў, заходнія фірмы дадаткова паставілі за свой кошт імпартнае абсталяванне і запчасткі на суму амаль 2,5 млн. марак ФРГ [9, с. 81].

У пэўных выпадках адбывалася зацягванне тэрмінаў здачы ў эксплуатацыю вытворчых магутнасцей. Замежныя спецыялісты абгрунтоўвалі гэта неабходнасцю замены дэфектных вузлоў і пастаўкі запчастак, якія выйшлі са строю падчас мантажу, правядзеннем дадатковых выпрабаванняў абсталявання. Прычым гэта супадала па часе з перыядамі ўскладнення міжнароднай абстаноўкі. Так, для асвятлення пульта аўтаматызаванага гумазмешвання, электронныя блокі пастаўляліся кансорцыуму "Дэкорфа" амерыканскай фірмай "Дыжыталь". Мантаж не пачынаўся ў сувязі з тым, што амерыканцы не дазволілі прадстаўнікам "Дэкорфы" ўсталяваць кампутар, матывуючы забарону падзеямі ў Афганістане. У той жа час з савецкага боку парушаліся тэрміны гатоўнасці будаўнічых пляцовак на 8–10 месяцаў [6, арк. 37]. Гэта давала падставу кіраўніцтву замежных фірмаў затрымліваць мантаж, здымаць гарантыйныя абавязацельствы.

Адсутнасць або недахоп складскіх памяшканняў на прадпрыемствах, прыводзілі да таго, што значная частка абсталявання доўгі час захоўвалася на адкрытых пляцоўках. Там абсталяванне прыходзіла ў непрыдатнасць. У 1980 г. на адкрытых пляцоўках ВА "Хімвалакно" захоўвалася імпартнае абсталяванне фірмы "Удэ" на агульную суму 175 млн. 500 тыс. марак ФРГ. Парушаліся ўмовы захоўвання згодна маркіроўкі і ўпакоўкі, дапушчалася змешванне абсталявання, якое прыбыло па розных кантрактах, не вёўся належны ўлік. Месцы складзіравання практычна не ахоўваліся. У выніку былі шматлікія выпадкі крадзяжоў, асабліва электроннай апаратуры. Так, на ВА "Бабруйскшына" у 1979 г. былі разукамплектаваны і скрадзены электронныя блокі трох кампутараў на агульную суму звыш 500 тыс. руб. [6, арк. 37, 38]

Пад час знаходжання ў БССР асобныя замежныя спецыялісты ўсхвалялі лад жыцця за мяжой, былі выпадкі распаўсюджвання парнаграфічнай і рэлігійнай літаратуры сярод моладзі. Паводле інфармацыі КДБ: "Большую частку вольнага ад працы часу спецыялісты ГДР праводзяць у рэстаранах, дзе захапляюцца спіртнымі напоямі, а таксама жанчынамі лёгкіх паводзінаў" [5, арк. 22]. Некаторыя спрабавалі збіраць інфармацыю разведвальнага характару. Адзначаліся факты засылання ў кантэйнерах з імпартным абсталяваннем ідэалагічна шкоднай літаратуры, правозу кантрабандных тавараў. За варожыя і правакацыйныя дзеянні, хуліганскія учынкі датэрмінова адкамандзіравалі з СССР 11 замежных спецыялістаў, якія працавалі ў Магілёўскай вобласці [6, арк. 39, 43].

Рэспубліканскія і рэгіянальныя ўлады, адміністрацыя прадпрыемстваў імкнуліся стварыць для замежных спецыялістаў належныя культурна-бытавыя ўмовы, арганізоўвалі паездкі ў Маскву, Ленінград, Мінск, Кіеў, наведванне святочных дэманстрацый, школ, дзіцячых устаноў, лепшых калгасаў. У Магілёве для замежнікаў у цэнтры горада была пабудавана гасцініца з басейнам. У той жа час былі праблемы з забеспячэннем транспартам, прадуктамі харчавання.

Выказванні нямецкіх спецыялістаў з ГДР, зафіксаваныя органамі КДБ, дазваляюць нам пазнаёміцца з тым як яны ўспрымалі савецкую рэчаіснасць. Непрыемнае ўражанне на замежнікаў зрабілі бруд і захламленасць працоўных пляцовак, месцаў захоўвання абсталявання, шматлікія спазненні беларускіх працаўнікоў на працу, працяглыя перакуры. Працаваўшыя на "Электрарухавіку" зрабілі

выснову, што "падрыхтоўка савецкіх спецыялістаў не адпавядае патрабаванням, умовы працы дрэнныя". Адзначаліся частыя выпадкі крадзяжоў мясцовымі работнікамі ў замежных спецыялістаў некаторых дэталей кантрольна-вымяральных прыбораў, інструмента, насільных рэчаў, нават канцылярскіх прыналежнасцей. Да таго ж: "ва ўсіх прадуктовых крамах, нават агароднінных, уладкована сігналізацыя", "у крамах самаабслугоўвання падвойны кантроль – у касы і на выхадзе, гэта ж абраза, няма даверу да людзей" адсюль высновы: "значыцца ў гэтым ёсць неабходнасць" і "Магілёў – сталіца крадзяжоў" [5, арк. 20адв., 21].

Параўноўваліся ўмовы жыцця савецкага Магілёва і гарадоў усходняй Германіі, дзе таксама будаваўся сацыялістычны лад: "Умовы жыцця цяжкія. Купіць няма чаго, нават зараз улетку мала гародніны і садавіны", "харчовыя крамы выглядаюць найгоршым чынам, ёсць толькі асобныя прадукты як хлеб, тлушч, маргарын, гарэлка і чыста рускай нацыянальнай вытворчасці – крупы, кашы. Такія прадукты як каўбаса, яйкі, масла, гародніна, узвары бываюць вельмі рэдка і ў такія дні дзяжурыць міліцыя. У прамтаварных крамах лепш, але на ўзроўні як у нас [у ГДР] у 1945 г. Ва ўсякім разе, гэтай краінай я расчараваны". Замежнікаў уражваў не высокі ўзровень культуры савецкага гандлю: "За ўвесь час нашага знаходжання ў Магілёве, ніводная прадаўшчыца не звярнулася да нас са словамі "дзякуй", "калі ласка". У крамах няма абгорткавай паперы, газеты выкарыстоўваюць для пакавання тавараў" [5, арк. 21, 21адв.]. Безумоўна, у выказваннях адчувалася пэўная тэндыцыйнасць. Але сапраўды ў савецкі час была нізкая якасць абслугоўвання, у магазінах адсутнічалі некаторыя прадукты.

У выніку аператыўных дзеянняў Упраўленнем КДБ па Магілёўскай вобласці ад прадстаўнікоў фірмаў з ФРГ і Галандыі была атрымана каштоўная навукова-тэхнічная інфармацыя, якая па заключэнню аўтарытэтных спецыялістаў уяўляла цікавасць не толькі для прадпрыемстваў Магілёўскай вобласці, але і для савецкай прамысловасці ў цэлым. Здабытыя матэрыялы былі перададзеныя для рэалізацыі на прадпрыемствах СССР і БССР [9, с. 82].

Такім чынам, інфармацыя супрацоўнікаў КДБ дазваляе сцвярджаць, што стварэнне ва ўсходніх рэгіёнах БССР буйнога прамысловага комплексу адбывалася з выкарыстаннем тэхналагічнага вопыту вядучых краін свету і імпартнага абсталявання, якое на той час з'яўлялася інавацыйным для айчыннай вытворчасці. Сумесная праца з замежнымі спецыялістамі дазволіла беларускім рабочым і інжынерна-тэхнічным работнікам глыбей пазнаёміцца з перадавымі тэхналогіямі, павысіць сваю кваліфікацыю, умацаваць кадравы патэнцыял Савецкай Беларусі. У выніку шэраг прамысловых прадпрыемстваў выйшлі на ўзровень, які адпавядаў тагачасным дасягненням навукі і тэхнікі і занялі вядучыя пазіцыі ў эканоміцы рэспублікі, а таксама СССР і Еўропы. На эфектыўнасць выкарыстання імпартнага абсталявання і замежных спецыялістаў уплывала не толькі эканамічная кан'юктура, але і знешнепалітычныя фактары, а таксама наяўнасць вялікай колькасці непаладак і недахопаў, характэрных для савецкага перыяду айчыннай гісторыі.


1. Войтович, С. Д. БССР в экономических отношениях СССР с зарубежными странами (1945–1987) / С. Д. Войтович. – Минск : Наука и техника, 1989. – 184 с.
2. Воробей, Н. С. Участие Белорусской ССР в отношениях Советского Союза с капиталистическими странами (50–70-е годы) / Н. С. Воробей. – Минск : Наука и техника, 1981. – 248 с.
3. Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Т. 6 : Беларусь у 1946–2009 гг. / Л. Лыч [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск : Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
4. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. : у 2 кн. – Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 654 с.
5. Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці (далей – ДАГАМаг). – Ф. 9. Воп. 151. Спр. 58.
6. ДАГАМаг. – Ф. 9. Воп. 165. Спр. 73.
7. Нарысы гісторыі Беларусі : у 2-х ч. – Ч. 2 / А. П. Касцюк [і інш.] ; Інстытут гісторыі АНБ. – Мінск : Беларусь, 1995. – 560 с.
8. Несцяровіч, М. Эканамічнае становішча Беларусі (1970-я – першая палова 1980-х гг.) / М. Несцяровіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск : Бел. навука, 2014. – Вып. 29. – С. 201–208.
9. Пушкін, І. А. Кадравы патэнцыял прамысловасці ўсходніх рэгіёнаў БССР (1944–1991) : манагр. / І. А. Пушкін, А. Р. Агееў. – Магілёў : БДУТ, 2022. – 302 с.
10. Шадурский, В. Г. Культурные связи Беларуси со странами Центральной и Западной Европы (1945–1990-е гг.) / В. Г. Шадурский. – Минск : БГУ, 2000. – 285 с.


**Карпекін К.Р.**

## БІБЛІЯТЭКІ КУЛЬТАВЫХ БУДЫНКАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў ПАЧАТКУ 1980-Х ГГ.

У 1982 г. супрацоўнікі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР ажыццявілі экспедыцыю па культавых будынках, мэтай якой было выяўленне аб'ектаў культурнай вартасці, што знаходзіліся ў карыстанні рэлігійных абшчын. Апісанню і фотафіксацыі падлягалі розныя катэгорыі богаслужбовых прадметаў (абразы, крыжы, званы, святарская вопратка), у тым ліку і кнігі. На тэрыторыі Віцебшчыны навукоўцы наведалі 66 малітоўняў, сярод якіх – 41 праваслаўную царкву, 11 каталіцкіх касцёлаў і 14 стараабрадніцкіх малітоўных дамоў. Паколькі вопісы значных гісторыка-культурных